А СЭРЦА УСЕ КЛІЧА...

За бібліятэчным сталом сядзіць шчуплая, з добрым адкрытым тварам жанчына. У вялікіх прамяністых вачах адчуваецца малады, поўны энергіі задор, непагасны агонь гарачага сэрца. Вера Абрамаўна роўным убарыстым почыркам запісвае ў картачку назвы кніг, якія падабрала сабе белакурая прыгожая дзяўчына, і ў той жа час раіць другому чытачу, што любіць ваенную і мемуарную літаратуру, творы:

— Пачытайце, калі ласка, Дзімітрыя Шчаглова «Упаўнаважаны ваеннага савета». Цікавая кніга, адлюстроўвае апошні этап Вялікай Айчыннай вайны. Аўтар ставіць пытанне аб паводзінах рускага салдата на тэрыторыі ворага.

Голас у Веры Абрамаўны таксама малады, звычны, з правільнай разгаворнай інтанацыяй. Вось толькі заўчасныя на твары маршчыны вызначаюць яе паўвекавы ўзрост, шлях нялёгкага, беспакойнага жыцця.

— Вам, як бачна, падабаецца літаратура пра народных мсціўцаў, — не адрываючыся ад запісу, звяртаецца бібліятэкар да шыракаплечага, таўсматага мужчыны, які разглядае аб'ёмістую кнігу Аляксандра Адамовіча «Партызаны». Пры гэтым вочы Веры Абрамаўны загараюцца іскаркамі, і яна дапытліва глядзіць на чытача. Відаць, таксама зведаў партызанскага жыцця? — Нябойсь, партызанілі?

— Прышлося, — коратка адказвае мужчына. — Пахадзіў па лясных сцежках-дарожках.

— Цяжкія і незабыўныя гэта часіны, — жанчына кладзе на чарнільны прыбор ручку і адчуваецца, што яна настолькі перайначылася, што быццам пераняслася на дзесяткі гадоў назад, у тыя далёкія ваенныя дні, калі па краіне гулялі пажары, пелі свае смяртэльныя песні кулі ды асколкі снарадаў. — Я вось таксама была ў партызанах і вельмі крыўдна чуць ад некаторых размовы аб тым, быццам мы толькі і хаваліся ў лесе, не прычыняючы ніякай шкоды фашыстам. Як гэта несправядліва! Толькі адзін наш атрад імя Ракасоўскага, якім камандаваў Макар Серафімавіч Цанава, знішчыў сотні нямецкіх салдат і афіцэраў, у складзе брыгады імя Жукава граміў паліцэйскія гарнізоны, узрываў масты, псаваў сувязь. Не, не хаваліся мы ў кустах, не сядзелі, склаўшы рукі.

Праступіўшы на твары лёгкі румянец выдае хваляванне жанчыны. Гутарка зацягваецца, і яе не без цікавасці слухаюць зайшоўшыя абмяняць кнігі. Вера Абрамаўна раптам спахліяецца і, яшчэ больш чырванеючы, просіць прабачэння, што захапілася ўспамінамі, адарвалася ад сваіх спраў. Нічога, яна раскажа аб дзейнасці партызан на спецыяльных сустрэчах, якіх ужо было нямала, раскажа не для таго, каб пахваліцца сабой, тым што і яна, Вера Абрамаўна Шаніра, цяпер сціплы работнік раённай бібліятэкі, была ў радах народных мсціўцаў, каб людзі, і асабліва моладзь, ведалі, як змагалася старэйшае пакаленне з фашысцкай нечысцю, як людзі ішлі на смерць, каб не даць лютай заразе апаганіць рускую зямлю. Вера Абрамаўна не пускала над адхон эшалонаў, не нападала на гарнізоны і не знімала меткай куляй паліцэйскіх вартавых. Не. Яна даіла ў атрадзе кароў, якіх было паўтара дзесятка, мыла бялізну, шыла з парашутаў масхалаты, заставалася з ранеными і хворымі. У атрадзе яе так і называлі — сястра Вера. Гераізму асаблівага жанчына не праявіла, але яе сціплую і нялёгкую працу і само партызанскае жыццё можна паставіць побач з гераізмам. Колькі радасці і жыватворнай сілы ўлівала, напрыклад, партызану новая свежая кашуля, пашытая рукамі сястры Веры, з якім задавальненнем надзяваў на сябе баец, ідучы ў разведку масхалат, сшыты рукамі жанчыны. Можа толькі ён і выратаваў не аднойчы партызану жыццё, зліўшыся з белым снегам. А што значыць своечасова накарміць раненага свежым малачком, падбадзёрыць цёплым словам, супакоіць хваляванне.

І вось былая партызанка — у Опсаўскай школе-інтэрнаце. З замірaннем слухаюць яе выхаванцы школы. А Вера Абрамаўна расказвае, як яна яшчэ да ўхода ў партызаны была звязана з падпольнай групай, дапамагала перапраўляць у атрад уцёкшых з лагераў ваеннапалонных. А потым, летам 1943 года, калі яе западозрылі, накіравалася сама ў атрад.

Глыбокае ўражанне пакінула сустрэча з Верай Абрамаўнай у навучэнцаў Булойкаўскай школы, Мяжанскай васьмігодкі, Барадзяніцкай сярэдняй школы, у дапрызыўнікаў. Хтосьці з будучых салдат пацікавіўся, ці ёсць у Веры Абрамаўны ўрадавыя ўзнагароды. Жанчына не без гонару адказала, што партыя і ўрад не пакінулі яе без увагі. Яна ўзнагароджана медалямі «Партызану Айчыннай вайны» I-й і II ступеняў, медалем «Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны», «За перамогу над Германіяй» і юбілейным медалем у сувязі з 20-годдзем з дня Перамогі над фашысцкай Германіяй.

Але гэта так сказаць з экскурса ў мінулае. Чвэрць века настаўніца працаўніца нясе нялёгкую ношу бібліятэкара. Жанчына не абмяжоўваецца работай непасрэдна за абанентным сталом і сямігадзінным рабочым днём. Часта можна бачыць, як з поўнай сумкай кніг яна спяшаецца да хворых у раённую бальніцу, у дом састарэлых, а то і проста на кватэру свайго чытача. Заўсёды цікавіцца, каму якая падабаецца літаратура і стараецца задаволіць наведвальніка.

—Цяпер лягчэй, — расказвае Вера Абрамаўна. — А вось памятаю, як мы стваралі бібліятэку на толькі што вызваленай ад ворага тэрыторыі. Прыходзілася збіраць кнігі па хатах, вышукваць у розных месцах, нават купляць. А цяпер толькі ў мінулым годзе было 30 тысяч кніга-выдач, якімі карысталіся 2140 чытачоў. Любяць нашы людзі кнігу.

І Вера Абрамаўна называе актыўнейшых чытачоў. Гэта пастух з вёскі Буцеўцы Іосіф Бейнар, рабочніца аптэкі, камсамолка Ала Мікшта, дамашняя гаспадыня Браслава тав. Раманава.

Чвэрць века клапатлівай, неспакойнай працы. Менавіта клапатлівай, інакш не атрымала б Вера Абрамаўна Ганаровай граматы Міністэрства культуры СССР, такой жа Граматы Міністэрства культуры БССР, граматы раённага аддзела культуры і дзвюх грамат таварыства Чырвонага Крыжа.

Неспакойнае, гарачае ў гэтай, здавалася б зусім кволай жанчыны сэрца, якое ўсё кліча і кліча ўперад.

Я. МАЛЯЎКА.

